# БЕЛАРУСКІ РАМАН ДЛЯ ПАДРАСТАЮЧАГА ПАКАЛЕННЯ Ў КАНТЭКСЦЕ ВЫХАВАЎЧЫХ ЗАДАЧ СУЧАСНАСЦІ

**Кавалюк А. С.**
*УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”*

***Анатацыя***. У артыкуле актуалізуецца праблема выкарыстання духоўна-аксіялагічнага патэнцыялу твораў раманнага жанру сучаснай літаратуры ў выхаванні моладзі.

***Ключавыя словы:*** раман, аўтар, духоўна-аксіялагічны патэнцыял, выхаванне, моладзь, каштоўнасныя прыярэтэты.

У “Праграме бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на 2021–2025 гг.” сфармуляваны асноўныя накірункі гэтай дзейнасці: ідэалагічнае, грамадзянскае і патрыятычнае, духоўна-маральнае, полікультурнае, экалагічнае, эканамічнае, працоўнае і прафесійнае, прававое, сямейнае і гендарнае, эстэтычнае выхаванне, выхаванне інфармацыйнай і псіхалагічнай культуры, культуры бяспечнай жыццядзейнасці і здаровага ладу жыцця, культуры побыту і вольнага часу.

Сярод раманаў беларускіх пісьменнікаў, вынесеных для вывучэння ў раздзеле “Беларуская літаратура на сучасным этапе” ў 11 класе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, раман-споведзь А. Савіцкага “Пісьмо ў Рай” і раман І. Чыгрынава “Вяртанне да віны” ваеннай тэматыкі. Для вывучэння літаратуры на павышаным узроўні прапанаваны раман Л. Дайнекі “Меч князя Вячкі” гістарычнай тэматыкі. Несумненна, кожны з гэтых твораў надзелены выхаваўчым патэнцыялам, аднак гэта элітарная літаратура, якая не зусім адпавядае чытацкім зацікаўленням сучаснай моладзі. У сучаснай

беларускай літаратуры ёсць аўтары, якія не проста гэтыя запатрабаванні ўлічваюць, але арыентуюцца на іх.

Да такіх творцаў даследчыкі справядліва адносяць Л. Рублеўскую. Пра яе арыентацыю “на запатрабаванні моладзевай чытацкай аўдыторыі <...> сведчаць паслядоўнасць аўтара ў вытлумачэнні этычных ацэнак, выразная прысутнасць у кожным творы героя-ідэала, імкненне да вострасюжэтнасці, драматычнай напружанасці і дынамічнасці ў паказе падзей. Проза Л. Рублеўскай ахоплівае дастаткова шырокія праблемна-тэматычныя абсягі, вызначаецца жанрава-стылёвай разнастайнасцю, наватарскімі пошукамі, эксперыментальнасцю” [1, с. 17].

У рамане “Скокі смерці” інтрыгуюча для юнага чытача найперш спрацоўвае жанравае вызначэнне твора – гатычны раман. Даследчыцы Л. Алейнік і І. Шаўлякова-Барзенка справядліва заўважаюць, што ў рамане-інструкцыі “Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію” “для моладзевай чытацкай аўдыторыі, несумненна, інтрыгоўнымі і прывабнымі выглядаюць і ключавое слова «Гульня» ў назве твора, і аўтарскае жанравае вызначэнне «раман-інструкцыя», і кампазіцыйнае афармленне мастацкага тэксту, які выбудаваны як своеасаблівы «квест». <...> Наватарства Л. Рублеўскай яшчэ і ў тым, што ў форме «квест-прозы» з элементамі папулярных у сусветнай літаратуры жанраў дэтэктыва і фэнтазі, прыгодніцкага і любоўнага раманаў, яна адаптуе для юнацтва сур’ёзныя і складаныя старонкі <...> нацыянальнай гісторыі” [1, с. 18]. Інтрыгуе чытача і лацінская назва зямлі, дзе сёння жывуць беларусы, – «Alba Ruthenia» альбо «Albaruthenia» – Белая Русь, вынесеная таксама ў назву твора, і літаратурны прыём “падарожжа ў часе”, дзякуючы якому ўдзельнікі “Гульні”, адкрыўшы “прагал у сцяне”, трапляюць у 1930-я гады. Раман “Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію” Л. Рублеўскай, як і іншыя яе творы, выхоўвае лепшыя грамадзянскія і патрыятычныя

пачуцці, фарміруе каштоўнасныя прыярэтэты і спрыяе духоўна-маральнаму выхаванню. Героі твораў гэтай пісьменніцы вырашаюць адвечныя праблемы выбару паміж годнасцю і подласцю, каханнем і здрадай, захаваннем гістарычнай памяці і бяспамяцтвам.

Пры выбары твораў для школьнага вывучэння неабходна кіравацца не толькі зместавым іх напаўненнем, але і невялікім памерам, што для дадзенай катэгорыі чытачоў надзвычай важна. Сярод такіх твораў могуць быць раманы-эсэ празаіка, паэта, літаратуразнаўцы А. Лойкі “Як агонь, як вада” (1984) аб Янку Купалу, “Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае” (1990), “Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі” (2009), у якіх не толькі канцэптуальна, але і лірычна, эмацыянальна, узнёсла асэнсаваны постаці славутых беларусаў. Першы і апошні з гэтых раманаў невялікія па памеру. Раманы-эсэ А. Лойкі могуць быць запатрабаванымі для вывучэння ў школе, бо распавядаюць аб жыццёвых перэпетыях добра вядомых школьнікам пісьменнікаў, пашыраюць іх веды. Да таго ж сучаснай сістэмай адукацыі актуалізуецца напісанне творчых прац вучнямі, у тым ліку і эсэ.

Сярод твораў для вывучэння выпускнікамі можа быць раман-жыціе “Пакліканыя” (1994) В. Коўтун, прысвечаны святой Еўфрасінні Полацкай. У прадмове да твора аўтарка распавядае пра гісторыю яго стварэння і фактаграфічную аснову твора: “Распачаць стварэнне рамана-жыція, прысвечанага не проста незвычайнай жанчыне свету, а святой Апякунцы цэлага народа, падзвігла мяне, думаецца, найперш шматгадовая праца ў Міжнародным жаночым фондзе святой Еўфрасінні Полацкай. Аднак узяцца за пісьменніцкае пяро насмелілася я толькі пасля неардынарнай падзеі – начнога аб’яўлення мне самой Еўфрасінні. Прыбачыўся якраз той момант, калі найпадобнейшая ігумення з Полацка разам з іншымі паломнікамі праходзіла праз пяскі грознай Іудзейскай пустыні, пэўна,

кіруючыся ў горад свае запаветнае мроі – Ерусалім. У тую ж незабыўную ноч былі напісаны і першыя часткі рамана, што далі штуршок роздумам пра агульны змест і развіццё характару галоўнай гераіні. Затым пачаліся няўтомныя пошукі факталагічнага матэрыялу, што ўключылі і летапісныя звесткі, і зборы «Живописной России», гістарычныя фаліянты М. Карамзіна, даследаванні М. Мікалаева, вядомыя царкоўныя жыція ігуменні, кнігі тыпу «Очерки по истории русской святости» (1991), «Палестина и места, освященные учением и страданиями Апостолов...» (1838), працы А. Мельнікава, Г. Запартыкі, У. Арлова, іншых даследчыкаў, шматтомныя даведнікі і энцыклапедыі. Пры гэтым на першым месцы, вядома, адзначу важнасць пастаяннага чытання Новага Запавету і Псалтыра. Асабліва важныя звесткі прыйшлі да мяне таксама пры знаёмстве з працамі не толькі такіх вядомых нашаму сучасніку святароў, як Аляксандр Мень, але таксама філосафаў і выбітных тэолагаў ХІІ стагоддзя, з якімі знаёмілася я падчас наведвання бібліятэкі Свята-Петрапаўлаўскага сабора Мінска” [2, с. 3].

Сярод сучасных гісторыка-прыгодніцкіх твораў для моладзі можа быць цікавым раман Я. Конева “Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі” (2004), працягам якога сталі “Грэчкасейная ідылія Тадэвуша Касцюшкі” (2008) і “Літоўская адысея Тадэвуша Касцюшкі” (2009). У першым з твораў пісьменнік расказаў, за што нашага земляка ўдастоілі звання нацыянальнага героя ЗША. Раман “Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі” годна ўпісваецца ў сучасную гістарычную прозу, прысвечаную выбітным гістарычным асобам. Разам з гэтым, аўтару ўдалося стварыць карціну змагання амерыканцаў за сваю незалежнасць, распавесці аб утварэнні ЗША, прадставіць вобраз нацыянальнага героя Вашынгтона. Асабліва выйгрышна твор вылучаецца з шэрагу іншых сваім духоўна-аксіялагічным зместам. Яго аўтару ўдалося Тадэвуша Касцюшку паказаць

не толькі таленавітым прафесіяналам, знаўцам сваёй справы, але і духоўна багатай асобай, якая жыве ў гармоніі са светам, умее наладжваць міжасабовыя зносіны і займаецца парадкаваннем уласнай душы. У рамане паказана таксама самаадданае каханне Касцюшкі да Людвікі Сасноўскай, выдадзенай замуж за іншага. Я. Конеў прадэманстраваў майстэрства раскрыцця ўнутранага свету сваіх герояў, выявіў уласныя каштоўнасныя прыярэтэты.

Духоўна-аксіялагічны патэнцыял названых раманаў Л. Рублеўскай, А. Лойкі, В. Коўтун, Я. Конева павінен выкарыстоўвацца ў сучасным адукацыйна-выхаваўчым працэсе, спрыяць разнастайным накірункам выхавання падрастаючага пакалення.

## Сисок литературы

1. Алейнік, Л. Сучасная беларуская проза для дзяцей і юнацтва як сродак інкультурацыі (на прыкладзе рамана Людмілы Рублеўскай «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію») / Л. Алейнік // Веснік БДУ. Сер. 4. – 2014. – № 1. – С. 16–20.

2. Коўтун, В. Пакліканыя : раман-жыціе / В. Коўтун. – Мінск : Маст. літ, 2007. – 247 с.